6. История на България. Българска академия на науките. Т. 1. София, 1954.
7. *Грек И. Ф.* Общественное движение и классовая борьба болгар и гагаузов юга России (конец 20-х — середина 50-х гг. XIX в.). Кишинев, 1988.
8. *Никитин С. А.* Славянские колонисты в России. М., 1960.
9. *Забунов И. Д.* Болгары юга России и национальное болгарское возрождение в 50—70-е годы XIX в. Кишинев, 1981.
10. *Маркова Л. В.* Поселения и жилище болгар-переселенцев в Бессарабии. М., 1953.
11. *Маркова Л. В.* Некоторые тенденции развития культуры и быта болгар юго-западных районов СССР. М., 1966.
12. Октябрь и болгарские интернационалисты. М., 1973. С. 278.

*SUMMARY*

*The article is dedicated to Historiography of Bulgarian migration to Russia during 1828-1834. The culture and mode of life of bulgarian migrator tendencies are October Revolution and Civil War are being researched.*

УДК 942.084

*І. Р. Чыкалава*

# ЖАНЧЫНЫ У ПАРЛАМЕНЦЕ І КАБІНЕЦЕ МІНІСТРАЎ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Універсальнае ў нашы дні права жанчын галасаваць і балаціравацца ў нацыянальныя парламенты практычна ўсіх краін свету выцесніла з памяці факт, што працэс заваявання жанчынамі гэтай формы дэмакратычнага ўдзелу расцягнуўся на стагоддзі. Напрыклад, англійскі парламент на працягу 563 гадоў (1265—1918) заставаўся «лепшым мужчынскім клубам у Лондане», а выбары 1918 г. сталі першымі, на якіх жанчыны былі дапушчаны да галасавання і балаціравання ў парламент.

Першай жанчынай, якая была выбрана ў Палату абшчын, была Канстанцыя Маркевіч [1]. Тым не менш, будучы ўдзельніцай барацьбы ірландскага народу супраць брытанскага праўлення, яна далучылася да другіх дэпутатаў, якія атрымалі перамогу на парламенцкіх выбарах 1918 г. ад партыі Шын Фейн і адмовіліся заняць свае месцы ў парламенце. Таму першай жанчынай, якая стала членам англійскай Палаты абшчын, была ўраджэнка ЗША лэдзі Нэнсі Астар, выбраная ў выніку дадатковых выбараў у 1919 г. [1]. Пад-

крэслім, што лэдзі Астар не зусім адпавядала перадваеннаму суфражысцкаму ідэалу жанчыны-парламентарыя: багатая арыстакратка, яна атрымала ў спадчыну месца ў выбарчай акрузе мужа. Двума гадамі пазней да лэдзі Астар далучылася Маргарэт Вінтрынгем, удава другога дэпутата. Абедзве жанчыны дабіліся паўторнага поспеху на выбарах 1922 г. Аднак і наступная выбраная ў 1923 г. у парламент жанчына — вядомая камедыйная актрыса Мейбл Філіпсан балацiравалася пасля таго, як яе муж страціў месца у парламенце з-за несумленных паводзін агента. Такім чынам, першыя тры жанчыны ў парламенце занялі месца сваіх мужоў.

У наступныя гады жанчынам хаця і ўдалося дабіцца пэўных поспехаў на палітычнай арэне, аднак яны былі нязначнымі. Перад роспускам парламента склікання 1974—1979 гг. у Палаце абшчын засядала толькі 27 (4,3%) дэпутатаў-жанчын [2]. Жанчыны ў рэкорднай колькасці балацiраваліся ў 1979 г. у чарговы састаў парламента, але канчатковая лічба атрымаўшых перамогу была нездавальняючай. Толькі 19 дабіліся поспеху: 11 лейбарыстак і 8 кансерватарак, уключаючы Маргарэт Тэтчэр, выбраную партыйным лідэрам у 1975 г. [3]. Іроніяй выбараў 1979 г. было тое, што з вылучэннем Тэтчэр на ролю першай на Захадзе жанчыны — кіраўніка ўрада — жаночае прадстаўніцтва ў Палаце абшчын дайшло да самага нізкага ўзроўню за чвэрць стагоддзя. Меншай была колькасць толькі ў час перамогі Чэрчыля ў 1951 г., калі было выбрана 17 жанчын. Цяпер жа, хоць жанчына і заняла пасаду кіраўніка Кансерватыўнай партыі і кіраўніка ўрада, да дасягнення палітычнай роўнасці брытанскім жанчынам было яшчэ далёка. Другіх жанчын, за выключэннем прэм'ер-міністра ў Кабінеце не было, і толькі трое займалі ўрадавыя пасады: Салі Опенгейм, Лінда Чолкер і баранэса Йанг. Дзвюма «стратамі» з парламента склікання 1974—1979 гг. сталі Одры Уайз і Маргарэт Бейн; адыход гэтых ліберал ак азначаў, што толькі дзве палітычныя партыі — кансерватыўная і лейбарысцкая — змаглі забяспечыць прадстаўніцтва жанчын у парламенце. Паражэнне ж былога Дзяржаўнага сакратара па справах адукацыі і навукі Шырлі Вільямс пазбавіла парламент адной з самых яркіх асоб. У 1981 г. яна выйшла з Лейбарысцкай партыі, каб стаць адным з заснавальнікаў Сацыял-дэмакратычнай партыі і першым дэпутатам, выбраным у Палату абшчын у лістападзе таго ж года на дадатковых выбарах пад новым партыйным сцягам. Вільямс стала прэзідэнтам СДП, якая пазней аб'ядналася з Ліберальнай партыяй. Выбары 1983 г. прывялі ў Вестмінстэр разам з 627 мужчынамі толькі 23 жанчыны (3,5%): 10 лейбарыстак і 13 кансерватарак, якіх, як і раней, узначальвала Маргарэт Тэтчэр [4]. Яшчэ пяцёра ўвайшлі ў Палату абшчын пасля дадатковых выбараў, што давяло агульны лік жанчын у ёй да 28 [5]. На выбарах 1987 г. у Парламент

прайшла 41 жанчына. Аднак гэта лічба складала толькі 6,3% ад усіх месцаў у Палаце абшчын [6]. Яшчэ пяцёра жанчын увайшлі ў парламент у выніку дадатковых выбараў.

Выбары 1992 г. прывялі 60 жанчын у парламент, патроіўшы іх прысутнасць за апошнія 20 гадоў. У іх ліку былі: 37 ад лейбарыстаў, 20 ад кансерватараў, 2 ад ліберальных дэмакратаў і адна ад Шатландскай нацыянальнай партыі. Дабілі-ся пераабрання 39 жанчын парламента склікання 1987—1992 гг., а лічба ўпершыню увайшоўшых — 21 — склала колькасны рэкорд [7]. Перад роспускам парламента ў сакавіку 1997 г. у ім засядалі 63 жанчыны. Нягледзячы на прыкметнае павелічэнне іх колькасці, у адносных лічбах яно заставалася нізкім — толькі 9,2% ад складу Палаты абшчын. У гэтых адносінах Вялікабрытанія яшчэ вельмі адставала ад такіх еўрапейскіх краін, як Нарвегія і Швецыя, дзе каля 41% дэпутатаў парламентаў і палавіна саставу урадаў — жанчыны. Сярод краін Еўрапейскага Саюза толькі Францыя, Грэцыя і Партугалія мелі меншы працэнт дэпутатаў-жанчын [8].

Некаторыя брытанскія парламентарыі ўваходзяць у амаль дынастычныя палітычныя кланы. Перад выбарамі 1997 г. было падлічана, што кожная чацвёртая жанчына паходзіць з сям'і, адзін ці больш членаў якой быў або з'яўляецца дэпутатам парламента. Такія сямейныя сувязі могуць быць выяўлены і ў кіруючай, і у апазіцыйнай фракцыях Палаты абшчын, што характарызуе яе ў многім як сямейна-арыентаваны інстытут. На гэта паказвае шмат прыкладаў. Лейбарыстка Клэр Шорт выйграла месца ў 1983 г., у той самы год, калі яе муж, Алекс Лайэн, пазбавіўся яго. Лейбарыстка Лін Голдынг не толькі заняла месца свайго мужа, якое вызвалілася ў 1987 г., але з'яўляецца таксама дачкой былога дэпутата парламента Нес Эдвардс. Кансерватар Вірджынія Ботамлі, якая ўвайшла ў парламент прыкладна праз дзесяць гадоў пасля выхаду з яго мужа, паходзіць з сям'і з доўгай гісторыяй знаходжання ў Палаце абшчын. Гвінет Данвудзі (у 1966 г.) і Брыджэт Прэнтыс (у 1992 г.) былі выбраныя адначасова з іх мужамі. За жонкамі следам ідуць дочкі: Хілары Армстронг атрымала ў спадчыну поспех бацькі ў якасці дэпутата пасля яго выхаду на заслужаны адпачынак. «Каралева» ж гэтай катэгорыі — Эма Нікалсан, у якой 3 дзядзькі, 10 дваюрадных братоў, дзед і 2 прадзеды засядалі ў Палаце абшчын. Зразумела, сямейныя сувязі не забяспечылі названым жанчынам аўтаматычны ўваход у парламент, ім у якасці кандыдатаў усё роўна прыйшлося пераадолець істотныя перашкоды селекцыйнага працэсу. Сама Эма Нікалсан была адвергнута кансерватыўнымі асацыяцыямі 27 выбарчых акруг перш чым атрымала магчымасць балаціравацца ў парламент.

Жанчыны-дэпутаты заўсёды актыўна праяўлялі сябе у

рабоце розных камісіи, аднак толькі ў час працы парламенцкай сесіі 1946—1947 гг. Флорэнс Пейтан стала першай жанчынай — часовым кіраўніком пастаянных камітэтаў Палаты абшчын і першай жанчынай, якая кіравала парламентам 31 мая 1948 г. Яна, аднак, сядзела не ў крэсле спікера, а за сталом, як у выпадку, калі палата засядае па камітэтах. Першай жанчынай, якая старшынствавала у крэсле спікера 2 ліпеня 1970 г. у час дэбатаў пасля каралеўскай прамовы, стала Бэці Андэрсан, у выніку чаго дэпутаты звярталіся да яе са словамі: «містэр намеснік спікера» [1]. У парламенце склікання 1992 г. жанчына ўпершыню была выбрана пастаянным спікерам: Бэці Бутройд пакінула за сабою доўгую чаргу са 154 спікераў-мужчын. Да свайго выбрання яна на працягу амаль пяці гадоў была намеснікам спікера і паспела заваяваць трывалы аўтарытэт у парламенце. Бутройд стала трэцім па ліку спікерам, які выйшаў з радоў Лейбарысцкай партыі. У тым жа годзе лейбарысты выбралі Маргарэт Бекет, яшчэ аднаго члена парламента, намеснікам лідэра партыі.

У цэлым на працягу 80—90-х гг. адбывалася паступовае павелічэнне ліку жанчын у парламенце, а да выбараў 1997 г. у Палаце абшчын засядалі ўжо 63 жанчыны, адна з якіх на працягу 5 гадоў займала важны пост яе спікера. Нягледзячы на гэта, Вялікабрытанія з'яўлялася характэрным прыкладам краіны, у якой правілы палітычнай гульні не садзейнічалі росту прадстаўніцтва жанчын, і, як вынік, на працягу многіх гадоў яны былі прадстаўлены ў нацыянальным парламенце вельмі нязначнай прапорцыяй.

Са 107 жанчын, якія засядалі у Палаце абшчын у розны час, 28 дасягнулі міністэрскага рангу, але толькі 8 з іх калі-небудзь знаходзіліся ў якасці поўных міністраў ва ўрадзе [1]. Кансерватыўная партыя не вылучала ні адной жанчыны ў ранг поўнага міністра амаль да 1951 г., калі Флорэнс Хорсбрух была назначана міністрам адукацыі ва ўрадзе Чэрчыля. Але нават тады ёй прыйшлося прачакаць тры гады да ўключэння яе ў Кабінет. Лейбарысцкая партыя ў гэтых адносінах была больш прыхільнай да жанчын. Першай жанчынай у лейбарысцкім урадзе стала Маргарэт Бондфілд, назначаная міністрам працы у 1929 г. Яна ж стала першай у Вялікабрытаніі жанчынай, якая ўвайшла ў Тайны савет — дарадчы орган пры манарху. Бондфілд страціла свой пост у выніку падзення лейбарысцкага ўрада ў 1931 г. У далейшым ні адна жанчына не ўключалася ў Кабінет амаль да стварэння лейбарысцкага ўрада Этлі ў 1945 г., калі Элен Вілкінсан атрымала пост міністра адукацыі. У 1950 г. яшчэ адна жанчына — Эдзіт Самерскіл — стала міністрам нацыянальнага страхавання, але па-за Кабінетам. Затое Барбара Кастл знаходзілася ўсе гады ў Кабінеце ў лейбарысцкім урадзе Гарольда Вільсана (1964—1970). На кароткі тэрмін да Барбары Кастл ва ўрадзе далучылася

Джудзіт Харт (1968—1969). Урад Гарольда Вільсана ўключаў таксама 6 жанчын, якія займалі дзяржаўныя пасты па-за Кабінетам. Дзве з іх працавалі памочнікамі міністраў, тры — на больш высокім узроўні дзяржаўных міністраў, і адна ўвайшла ў групу парламенцкіх палітычных арганізатараў, меўшую рэпутацыю «мужчынскага бастыёна». У Кабінеце Гарольда Вільсана (1974—1976) зноў былі дзве жанчыны: Барбара Кастл на пасадзе намесніка міністра па грамадскіх службах і Шырлі Вільямс на пасадзе намесніка міністра па цэнах і абароне спажыўца. Але толькі апошняя зберагла месца ва ўрадзе Джэймса Калагэна (1976—1979) у якасці намесніка міністра адукацыі і навукі.

У час 11-гадовага прабывання Маргарэт Тэтчэр на пасадзе прэм'ер-міністра ўсяго 10 жанчын атрымалі міністэрскія назначэнні. Сама Тэтчэр стала толькі другой жанчынай у гісторыі сваёй партыі, якая з пасадай намесніка міністра адукацыі і навукі ва ўрадзе Эдварда Хіта (1970—1974) заняла поўную кабінетную пазіцыю. На працягу ўсяго доўгага прэм'ерства «жалезнай лэдзі» толькі адна жанчына, лэдзі Йанг, з'явілася ў яе Кабінеце. Адыходзячы ў 1990 г. у адстаўку, Тэтчэр пакінула Кабінет, які ўключаў адных мужчын. Джон Мейджар, хаця і запрасіў Джудзіт Чаплін быць яго палітычным саветнікам і Сару Хог кіраўніком палітычнай часткі, наклікаў на сябе сур'ёзную крытыку за адсутнасць жанчын у першым саставе свайго Кабінета. Ён паправіў карціну перастаноўкамі пасля парламенцкіх выбараў 1992 г., калі назначыў Джыл Шэферд намеснікам міністра занятасці, а потым кіраўніком важнага дэпартамента адукацыі і занятасці Вірджынія Ботамлі, якая некаторы час працавала намеснікам міністра аховы здароўя, атрымала партфель у дэпартаменце дзяржаўных маёмасцяў. Падзеяй з'явілася назначэнне Стэлы Рымінгтан главой МІ 5 — аднаго з падраздзяленняў службы бяспекі. Тым не менш да 1995 г. толькі 7 міністраў былі жанчыны, што з'явілася самай нізкай прапорцыяй у Еўропе.

Для выяўлення значэння жаночага фактару ва ўнутрыпартыйнай палітыцы выключна паказальнымі аказаліся выбары 1997 г. Нягледзячы на асобныя спробы кіраўніцтва кансерватараў аказаць ціск на мясцовыя арганізацыі з мэтай павелічэння колькасці кандыдатаў-жанчын, у цэлым партыя прадэманстравала практычна поўную адсутнасць інтарэсу да іх вылучэння ў выбарчыя органы, калі не лічыць муніцыпальны ўзровень. У той жа час лейбарысты зрабілі стаўку менавіта на жанчын, вылучаючы іх у вялікай колькасці кандыдатамі ў парламент і апелюючы да жанчын-выбаршчыкаў. Як вынік, выбары 1 мая 1997 г. сталі днём моцнага паражэння кансерватыўнай партыі і гучнай перамогі лейбарыстаў. Пасля пройгрышу ў выбарах кансерватары правялі ў Палату абшчын толькі 13 жанчын, тым самым

скарацілі і без таго іх невялікае прадстаўніцтва ў сваёй парламенцкай фракцыі яшчэ на 6 чалавек[1]. Пры такой тэндэнцыі кансерватары рызыкуюць астацца наогул без жанчын у парламенце. Кансерватары з іх традыцыйнымі адносінамі да ролі жанчын у грамадстве і ў сям'і разлічыліся паражэннем, якое пераканаўча прадэманстравала страту імі падтрымкі саміх жанчын, якія былі ў недалёкім мінулым галоўнай апорай партыі. У такой сітуацыі партыя не зможа выйсці з крызісу без усеабдымных і ўсебаковых рэформ, якія ўключаюць і змену ў поглядах на статус жанчын. Гэта — урок і другім палітычным сілам і рухам, якія недаацэньваюць значэнне «жаночага фактару» ў палітыцы.

У той жа час выбары далі 101 месца лейбарыстам. У Лейбарысцкай фракцыі сёння кожны чацвёрты дэпутат — жанчына. У новым урадзе Тоні Блэр 5 з 22 пастоў прадаставіў жанчынам. Адным з першых крокаў стала стварэнне міністэрства па справах жанчын [10]. Пост аднаго з іх кіраўнікоў заняла Джоан Радок, якая набыла нацыянальную вядомасць у 80-я гады ў якасці лідэра зялёнага руху ў краіне. У 1997 г. Радок была выбрана ў парламент на трэці тэрмін. Ужо на працягу першых дзесяці месяцаў існавання міністэрства была распрацавана нацыянальная стратэгія супраць насілля ў адносінах да жанчын, прапанавана новая сістэма клопату аб дзецях і 28 лютага 1998 г. прайшлі шырокія дэбаты ў парламенце па пытаннях урадавых прыярытэтаў у адносінах да жанчын.

Такім чынам, прыкметны прагрэс у руху жанчын да пазіцый уплыву на брытанскую палітыку бясспрэчны. У гісторыю краіны ўжо ўвайшлі жанчына-прэм'ер, жанчына-спікер і намеснік спікера Палаты абшчын, ёсць жанчыны ў Кабінеце, і малаверагодна, што поўны мужчынскі Кабінет будзе калі-небудзь створаны. Тым не менш жанчыны на старшых пасадах у брытанскай палітыцы да апошняга часу заставаліся ў абсалютнай меншасці. Гэта дэманструе факт, што нават у развітой дэмакратыі можа пераважаць мужчынскае асяроддзе і выдаляць жанчын з палітычных структур, уключаючы заканадаўчыя і выканаўчыя органы ўлады і кіравання, а таксама верхнія эшалоны дзяржаўнай службы.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. Factsheet: Women in the House of Commons // Public Information Office: House of Commons. London, 1994.
2. The Times Guide to the House of Commons. London. 1979.
3. Dod's Parliamentary Companion. London, 1980.
4. Dod's Parliamentary Companion. London, 1983.

[1] На выбарах 1 мая 1997 г. кансерватары атрымалі толькі 31,4% галасоў на фоне 44,4%, што былі аддадзены за лейбарыстаў [9].

5. The Times Guide to the House of Commons. London, 1987.
6. Dod's Parliamentary Companion. London, 1987.
7. Dod's Guide to the General Election 1992. London, 1992.
8. Women in the European Community. Luxemburg, 1992.
9. The Times. 1997. 4 May.
10. Independent on Sunday. 1997. 4 May.

*SUMMARY*

*In the article a conclusion is made on a sample of Great Britain, that inspite of the visible progress in advancement of women, till the last time women remained at the leading positions in absolute minority. This fact demonstrates that even developed democracy can have male look and excludes women from the political structures including legislative authority and executive structures as well as top ranks of the Civil Service.*

УДК 947.085 (476)

*А. А. Мігунова*

## Нямецкая прапаганда сярод вясковага насельніцтва Генеральнага Камісарыята Беларусь (ГКБ) у 1941—1944 гг.

Пасля правалу плана «бліцкрыг», калі стала відавочна, што вайна працягнецца яшчэ доўгі час, у дачыненні да насельніцтва акупіраваных тэрыторый Еўропы ўвогуле, і Беларусі ў прыватнасці, была зроблена стаўка на новую палітыку. Яе сутнасць заключалася ў актыўным прыцягненні мясцовага насельніцтва да супрацоўніцтва з новай уладай праз уплыў прапаганды. Асноўным аб'ектам, прапагандысцкай дзейнасці супрацоўнікаў Генеральнага Камісарыята было, зразумела, сялянства як найвялікшы сацыяльны элемент. На сялян накіроўваўся прапагандысцкі матэрыял па ўсіх тэматычных накірунках, але галоўным сярод іх займала агітацыя па ажыццяўленню праграм, распрацаваных нямецкай адміністрацыяй. Як паведамляў сакратару ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнку старшыня штаба партызанскага атрада «Стары» Курмачоў, у раёнах Віцебскай вобласці, і, паводле іншых звестак, у астатніх месцах Беларусі «нямецкая прапаганда стаіць на высокім узроўні: праз друк, радыё, кіно, царкву ў першай палове 1942 г. частка сялян згубіла веру ў вяртанне Чырвонай Арміі.

У большасці сваёй насельніцтва ўпэўнена, што Чырвоная Армія не вернецца, бо звестак аб становішчы на франтах няма, у той жа час немцы свае нават невялікія поспехі рэкламуюць як вялікія перамогі... Мінскі мітрапаліт заклікае насельніцтва змагацца з партызанамі, як з